# Полацкі дзяржуніверсітэт





Фота Нэлі Радзько

Міжнародны дзень тэатраў (27 сакавіка) у Полацкім дзяржуніверсітэце адзначылі прэм'ерай. На гэты раз заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь студэнцкі тэатр «АРТ» узяўся за пастаноўку твора У. Жарабцова «Спадарожнікі». У інтэрпрэтацыі «артаўцаў» п'еса атрымала назву «Іграй сваё жыццё прыгожа». У цэнтры ўвагі Ён *(Сяргей Шчарбакоў)* і Яна *(Ганна Шэлепава)* – спадарожнікі ў вагоне купэ цягніка. Каб не марнаваць дарэмна час, выпадкова знаёмыя вырашаюць «напісаць» жыццёвую гісторыю са шчаслівым канцом. Прыдуманыя імі персанажы – звычайныя людзі, якія мараць пра сапраўднае каханне: інжынер-рацыяналізатар Пётр Бяссонаў *(Сяргей Грыбаедаў)* – не ўпэўнены ў сабе малады чалавек з нізкім матэрыяльным дастаткам і дырэктар пральні Дуся Іванова *(Алеся Беражная)* – дзяўчына, якая шукае стабільнасці і шчырых пачуццяў у адносінах з мужчынамі. Выпадковая сустрэча ў кавярні зближае іх. Але мінуе пяць год, і галоўныя героі прадстаюць зусім іншымі. Дуся – забяспечаная жонка паспяховага бізнесмена Аляксандра *(Віталь Варанчонак)*, а Пётр – запатрабаваны спецыяліст і багаты чалавек. Лёс зводзіць іх зноў, аднак пройдзены жыццёвы шлях застаўляе задумацца над тым, што насамрэч мае вагу ў чалавечых узаемаадносінах.

Ён і Яна ўкладваюць у выдуманых герояў свае адчуванні, свой жыццёвы вопыт, таму шаблонныя персанажы хутка пераўвасабляюцца ў трапяткіх, напоўненых цэлай гамай пачуццяў людзей. Цікавыя сюжэтныя лініі, сэнсава-насычаныя дыялогі робяць гэту гісторыю зразумелай кожнаму, дакранаюцца да патаемных перажыванняў гледача. А незвычайныя рэжысёрскія вырашэнні надаюць пастаноўцы інтэрактыўны характар, уключаюць аўдыторыю ў дыялог спадарожнікаў.